**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
220004, г.Мінск, пр.Пераможцаў, 11, тэл. (017) 203 75 74, факс 203 90 45

# ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАДЫ ПА ПЫТАННЯХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

23.01.2018 № 04-01-01/1

Лідскі раённы
выканаўчы камітэт

**1. Аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці элементу нематэрыяльнай культурнай спадчыны "Традыцыйнае белаўзорыстае ткацтва Панямоння" ў г.Ліда Гродзенскай вобласці.**

Заслухаўшы інфармацыю малодшага навуковага супрацоўніка аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры дзяржаўнай ўстановы "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" Савіцкай М.В., носьбіта нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці Маркевіча Я.Я. і экспертнае заключэнне старшага навуковага супрацоўніка ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі" Віннікавай М.М. аб традыцыі белаўзорыстага ткацтва Панямоння, якая бытуе ў г.Лідзе Гродзенскай вобласці, ВЫРАШЫЛІ:

1.1. Прыняць да ўвагі, што белаўзорыстае ткацтва ўключае 10 тэхнік ткацтва (аднаўточнае двухнітовае з пераборам на дошкі, двухнітовае ткацтва, чатырохнітовае аднаўточнае, чатырохнітовае двухуточнае, пяцінітовае, шасцінітовае, васьмінітовае аднаўточнае і васьмінітовае двухуточнае ткацтва, дванаццацінітовае, двухбаковы перабор), якія дазваляюць стварыць палатно са складанай дробнаўзорыстай структурай паверхні, далікатнай фактурай і мяккай светаценню, утворанай своеасаблівым перапляценнем нітак асновы і ўтку менавіта белага колеру.

1.2. Адзначыць, што белаўзорыстае ткацтва з'яўляецца адметнай з'явай рэгіянальнай ідэнтычнасці Панямоння.

1.3. Пагадзіцца з неабходнасцю надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыі "А" нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека - "Традыцыйнае белаўзорыстае ткацтва Панямоння" ў г.Ліда Гродзенскай вобласці.

Намеснік Мініст...
Старшыня навук...
метадычнай ра...

А.А.Яцко

04 Хопар 203 75 66